Франц Сіўко

# Бялячык

Казкі і апавяданні

www.kamunikat.org

Мінск
Мастацкая літаратура
2003

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)5

Мастак Г. С. Грэк

Для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту

www.kamunikat.org

© Сіўко Ф. І., 2003
© Афармленне. ВРУП
“Мастацкая літаратура”, 2003

ISBN 985-02-0587-3

# Алфавіт

Казка

У адным горадзе жылі блізняты, брат і сястра. Дзяўчынку звалі Валяй, хлопчыка — Колем. Абое хадзілі ў другі клас, сядзелі побач за партаю, разам рабілі ўрокі.

Неяк задала настаўніца дзецям хатняе заданне: вывучыць алфавіт.

Вось сядзяць брат і сястра, вучаць. Раптам Коля кажа:

— Што за друнота гэты алфавіт? Навошта ён мне?

— Як гэта — навошта? — пярэчыць яму Валя.— Ты ж чуў, што Алена Іванаўна казала: без алфавіта не будзе на свеце ніякага ладу. Усё дагары нагамі перакуліцца. Алфавіт патрэбены.

— Табе патрэбен, ты і вучы яго,— кажа Коля.— А я лепш на вуліцу пайду, з сябрукамі ў хованкі пагуляю.

Ды як шпурне кніжку ў кут, як бразне дзвярыма! Кінулася Валя следам за братам, ды хіба яго дагоніш? Вярнулася дзяўчынка ў пакой, зноў разгарнула падручнік.

www.kamunikat.org

А Колева кнўжка ляжыць сумная ў куце, ледзь не плача. Абгортка на ёй парвалася, і бок баліць.

І літарам прыкра: пакрыўдзіў іх Коля. Сабраліся яны ў гурт ды давай раіцца, як нявыхаванага гультая пакараць. Доўга гаманілі-спрачаліся, але ж прыдумалі...

Вось сядзяць вучні ў класе, чакаюць настаўніцу. Уваходзіць Алена Іванаўна. Павіталася і кажа:

— Спачатку, дзеці, праверым хатняе заданне. А зробім гэта так: будзеце ўставаць і казаць па алфавіце кожны сваё імя. Ну, хто першы?

— Я! — падняла руку Алачка.—Маё імя Ала.

За Алай Бронік устаў, потым Галінка. Неўзабаве дайшла чарга да Колі.

А ён жа алфавіт не вучыў! Сядзіць і не разумее, чаму ўсе на яго пазіраюць. Нарэшце здагадаўся, устаў.

—Ну, што трэба сказаць? — пытаецца Алена Іванаўна.

— Няме взаць ляКо,— адказвае Коля.

Сказаў так і сам спалохаўся. Што за ліха: хочаш вымавіць адны гукі, а атрымліваюцца зусім іншыя.

— Што ты сказаў? — пацiснула плячыма настаўнiца.— Я нiчога не зразумела.

— Ён сказаў, што яго звацъ Коля,— прыйшла брату на дапамогу Валя.— Ён учора не хацеў вучыць алфавiт, вось лiтары яму за гэта i адпомсцiлi — пераблыталiся. Ну, што, патрэбен табе алфавiт цi не?

— Патрэбен,— адказаў Коля i сеў на месца.— I я яго абавязкова, абавязкова да наступнага ўрока вывучу.

www.kamunikat.org

# Кошка Мурка і коска

Казка

Жыў некалі ў адным горадзе хлопчык, звалі яго Віця. Рахманы быў малы і разумны, а вось словы вымаўляць ленаваўся. Спытае хто-небудзь у яго:

— Віця, колькі табе гадоў?

А ён у адказ:

— Пяць, состы пайсоў.

— Ай, сынок,— ушчувае маці.— Такі вялікі, а так непрыгожа кажаш! Учора ж умеў прамаўляць, няўжо за ноч забыўся?

— Пяць, шосты пайшоў,— паправіцца Віця. А пасля забудзецца на маміну навуку і зноў абы-як гаворыць: “сапка”, “чаравік”, “косык”.

Нервуюцца бацькі і бабуля. Хочуць дапамагчы хлопчыку, а як — не ведаюць. І з выхавацелькай у садку ўжо раіліся. І да ўрача вадзілі. Нічога не дапамагае, хоць плач.

Але вось здарыўся адзін выпадак. Неяк увесну прынёс Віцеў бацька з кірмашу кошку. Выпусціў яе з-за пазухі на падлогу, і ўсе ахнулі. Кошка была сапраўдная прыгажуня. Поўсць мела чорную, хвост доўгі і вочы, нібы вугельчыкі, агністыя.

— Мурка жывёліна вучоная,— сказаў бацька.— Яна ўмее лавіць мышэй, спрытна куляецца праз галаву і ўсё-усё разумее.

— Як добра! — узрадаваўся Вўця.— Я буду з ёй сябраваць.

Стала Мурка жыць у кватэры. Уначы на паляванне ходзіць, удзень дрэмле на канапе. І ўсё слухае, што людзі між сабою гамоняць. Асабліва да Віцевай аворкі прыслухоўваецца. Як толькі ён скажа "цаго" замест "чаго", адразу начупырыцца, саскочыць з канапы на падлогу і давай хадзіць узад-уперад. А то яшчэ мяўкаць пачне.

Аднаго разу згубіўся ў бабулі клубок з ніткамі. Пытаецца яна ў Віці:

— Унучак, ты не бачыў, дзе мой клубок?

— Бацыў,— адказвае Віця.— Мурка з ім гуляла. Трэба ў яе запытацца. Гэй, коска!

Бліснула Мурка вачыма ды як кульнецца праз галаву з канапы. Але да падлогі не даляцела, а ператварылася ў паветры ў нешта чорнае, вось такое з выгляду:

— Хто ты? — закрычаў перапалоханы Віця.

— Я — коска,— адказала істота.— Ты мяне паклікаў, вось я і з'явілася.

— Я не цябе клікаў...— разгубіўся Віця.— Праўда, баба? Я сказаў: “Гэй, коска!”

— Дык гэта і ёсць коска,— усміхнулася бабуля.— Вось, глянь у кнізе. Гэты знак — кропка. А гэты — коска. Яна раздзяляе ў сказе словы або часткі сказа.

— Але ж я Мурку клікаў, а не гэты знак! — упарціцца Віця.

Бабуля зняла акуляры, пахітала галавой.

— Ты няправільна назваў Мурку, яна і пакрыўдзілася,— сказала строаг.— Мурка кошка, а ты паклікаў коску. Вось яна і перарабілася на коску.

— Ой, прабач, даруй мне, кошка Мурка! — пачаў прасіць Віця.

Тут коска перакулілася колькі разоў у паветры і зноў ператварылася ў Мурку.

З таго часу Віця ўсе словы правільна вымаўляе. А ты?

# Знак на небе

Апавяданне

Хлопчык Міша вельмі баяўся дажджу. Абы ўбачыў дзе на небе аблачынку, так і бяжыць у хату хавацца. Усё яму здавалася, што дождж нешта кепскае з сабою нясе.

Вось аднаго разу сядзяць яны з маці на прызбе, леташні боб у міску перабіраюць. Раптам бачаць: цёмная хмара з-за лесу на вёску сунецца.

— Ой, мамачка, якая яна злосная! — кажа Міша.— Хадзем хутчэй у хату.

— Яна не злосная,— смяецца маці.

— Дык чаму ж тады пыхкае-грыміць? — пытаецца Міша.

— А таму, што цяжка ёй. Бо яна ж ваду нясе. З вады дождж зробіцца. А ён усім патрэбен: і людзям, і раслінам, і жывёле. Без дажджу анічога не вырасце на зямлі.

— А калі ён залье зямлю? І мы ўтопімся...

— Не залье, сынок,— кажа маці.— Дождж разумны, ён ведае, калі яму трэба спыніцца. Ён сам сабе знак падасць і спыніцца.

— Які ж гэта знак?

— А вось пабачыш.

Тым часам хмара насунулася зусім блізка. Грымнуў гром, і першыя кроплі пагрозліва забарабанілі па зямлі.

Міша з маці ўбеглі ў хату, селі на покуці, сядзяць. Тут маланка як блісне, гром як загрыміць! Ажно ўвушшу ў Мішы затрымцела.

— Які страшны дождж, мамачка!

— То не проста дождж, сынок,— кажа маці.— То навальніца. Яна заўсёды з маланкаю і перуном поруч ходзіць.

— А адкуль бяруцца пярун і маланка?

— Аблокі на небе сутыкаюцца, вось з гэтага грукат і святло атрымліваецца.

— А памятаеш — летась маланкі смалілі? — не супакойваецца Міша.— А перуна не было. Чаму так?

— То, напэўна, у канцы жніўня было, у пару "арабінавых" начэй. Але то не маланка была, сынок, а бліскавіца. Яна, сапрраўды, з перуном не сябруе. Бо пярун неспакойны, грымлівы такі. А яна стомленая на згоне лета. Ёй адпачыць хочацца.

Нарэшце навальніца пачала пакрысе аціхаць. Аддалілася грымоцце, не стала бачна маланак. Мама падышла да акна, адчыніла яго.

— Ай, як хораша! — сказала, удыхаючы свежае паветра.— А вунь і знак.

— Я хачу таксама паглядзець! — кінуўся да акна Міша.— Ой, дык я ж яго ведаю: то вясёлка. Гэта яе дождж пасылае, каб у пару спыніцца і не заліць усю зямлю. Ну, яна такая прыгожая, што яе нельбга не заўважыць. А значыць няма чаго баяцца.

З таго дня Міша перастаў баяцца дажджу.

www.kamunikat.org

# Пчолка і Абыяк

Казка

Жыў-быў на свеце Алесік. Разумны быў хлапчук, і прыгожы, і жвавы. Адно кепска: надта працаваць ленаваўся. За што ні возьмецца — усё абы-як зробіць. Загадае яму, напрыклад, бацька карову папаіць. Дык ён, каб да крыніцы не ісці, зачэрпне з лужыны бруднай вады напалову з гразёю і падасць жывёліне. Тая глытне раз, другі ды адыдзецца сумная ад вядра. Або папросіць Алесіка маці качанят папасвіць. То ён выганіць вывадак на лужок, а сам ляжа пад кустом у засені і засне. Гадзіну спіць, другую. Тым часам лісіца падкрадзецца і сцягне качаня ў нару.

І вось празвалі людзі Алесіка за ягонае нядбальства Абыякам. Дрэнна стала хлопчыку. Дзеці сябраваць з ім перасталі, гуляць не клічуць. Нават кошкі, сабакі і свінні кпяць з яго, уцякаюць, абы ўгледзелі толькі. Ніхто Абыяку не любіць, нікому ён не патрэбны.

Вось і задумаўся Алесік, як бы прыкрай мянушкі пазбавіцца. Думаў, думаў — нічога не

прыдумаў. Мусіў да Чараўніка па параду ісці. Той паслухаў хлопчыка і кажа:

— Парада адна, даражэнькі: працаваць трэба, як Пчолка. Тады і паважаць усе будуць.

Вярнуўся наш Абыяк дахаты, сядзіць, над словамі Чараўніка разважае. Раптам чуе: штосьці нібыта шаснула ля самага вуха. Схамянуўся Абыяк, падняў вочы, бачыць: Пчолка-медуніца мёд збірае. Ды спрытна так, борзда! Да адной краскі падляціць, да другой, да трэцяй, нырне глыбока ды зноў у лёт.

"Вось, значыць, як трэба працаваць, каб людзі паважалі!" — узрадаваўся хлопчык.

Растапырыў ён рукі, разагнаўся — ды як падскочыць угору, як зажыхае па-пчалінаму! Скакаў, скакаў, а ўзляцець так і не здолеў. Адно ногі аб камяні пазбіваў.

Заплакаў Абыяк.

Убачыла гэта Пчолка і кажа:

— Хіба слязьмі паможа-ж-жаш гору? Рабіць трэба, калі хочаш, каб людзі паваж-ж-жалі. Глядзі, якая я малая, а колькі ўсяго за дзень паспяваю. І кож-ж-ны гэтак мож-ж-жа.

— Я і раблю ўсё так, як ты,— кажа Абыяк.— Ды толькі вось чамусьці не атрымліваецца ў мяне нічога.

І зноў ён заплакаў ад крыўды і бездапаможнасці.

— Што ж-ж-ж ты плачаш, дурненькі? — пачала супакойваць яго Пчолка.— Працаваць, як я — зусім не значыць маю работу выконваць. Паглядзі: Мураш сваю робіць, Шпак сваю, Чалавек — сваю. У кож-ж-ж-нага свой занятак. А калі хто вельмі стараецца, пра таго каж-ж-жуць: “Як Пчолка працуе.” Працуй з душою — і цябе таксама пахваляць.

— А як гэта — з душою? — не разумеў Абыяк.

— З душою — значыць сумленна, дбайна,— сказала Пчолка і паляцела далей.

Паслухаў Абыяк Пчолку і ўзяўся па-сапраўднаму за працу. Любую, нават самую дробязную і брудную, як след пачаў рабіць. І дзіва: усё атрымлівацца ў яго стала. І ъсе паважаюць хлопчыка, усе сябраваць з ім хочуць. А галоўнае — Абыякам нўхто не называе.

Так зноў Алесік Алесікам стаў.

www.kamunikat.org

# Вожыкавы лекі

Казка

Здарылася гэта ўлетку, у месяцы ліпені. Дзяўчынка Галінка прыехала да бабулі ў вёску на канікулы.

— Ой, дзякуй, унучачка, што не забылася на мяне! — узрадавалася бабуля.— Адпачнеш, а потым і па гаспадарцы мне, нямоглай, дапаможаш.

Хораша летам у вёсцы! Усё навокал цвіце, усюды сонейка, цеплыня, бадзёрасць. Хоць і клопатаў хапае. Асабліва ў гародзе.

Вось павяла бабуля Галінку да лехаў. А там чаго толькі няма: і буракі, і кроп, і капуста, і морква, і гуркі. Але і пустазелля шмат.

Рве бабуля макрыцу і лебяду, а Галінка побач стаіць, назірае.

— Што ж, унучачка, не дапамагаеш мне? — пытаецца бабуля.

— Надта горача тут,— адказвае дзяўчынка.— Ад сонейка галава можа забалець, пайду лепш у засень.

Ідзе яна ў засень, туды, дзе пад яблыняй трускалкі растуць. Ягады чырвоныя, сакавітыя, так і

просяцца ў рот. Сарвала Галінка адну, другую... Ох, як смачна! Сарвала б яшчэ, ды згінацца няма ахвоты.

— Бабуля, дапамажы мне,— пачала прасіць.

Назбірала старая цэлы прыпол ягад, аддала ўнучцы. А сама зноў за працу прынялася. Да вечара палола. Нарэшце скончыла.

Пайшлі яны ў хату, селі на канапу, сядзяць. І кажа бабуля:

— Можа, унучачка, куранятам паесці занясеш? Я так стамілася, варухнуцца не магу.

— Ой, бабулечка, а хіба ж я не стамілася! — адказвае Галінка.— Гэтак старалася пад яблыняй, гэтулькі ягад паспытала. Не, нясў сама ежу сваім куранятам.

Устала бабуля з канапы, падалася да куранят.

Потым павячэралі, леглі спаць.

Раніцой устала бабуля і адразу да печы — сняданак унучцы гатаваць. Толькі сабралася цеста на аладкі разводзіць, глядзь у жбан: няма вады. Пайшла Галінку будзіць. Разбудзіла і кажа:

— Унучачка, кветачка, хацела я табе аладак спячы, ды вады ў хаце ні кроплі. Дык, можа, ты, мая птушачка, схадзіла б з вядзерцам да крыніцы?

Зморшчыла Галінка носік і кажа так:

— Што ты, бабуля, я спаць хачу! Твая карова ўсю ноч мычэла за сцяной, не давала мне заснуць. Ды і трава з раніцы ў расе, раптам я ножкі змачу і прастуджуся.

Што рабіць бабулі? Узяла яна вядро, прыгасіла агонь у печы ды падалася нацянькі да крыніцы. Ідзе і ледзь не плача ад крыўды.

Бяжыць ён насустрач Вожык.

— Чаго гэткая сумная, баба Волька? — пытаецца.— Ці не пакрыўдзіў хто?

— Вось, чакала ўнучачку з горада,— адказвае бабуля,— думала, дапаможа па гаспадарцы, а яна анічога рабіць не хоча. Прыкра мне і сорамна ад людзей, што ўнучка мая — гультайка.

— Сапраўды, няшчасце,— пагадзіўся Вожык.— Але ж ад ляноты ёсць добрыя лекі.

— Якія? Падкажы, братка Вожык! — пачала прасіць старая.

— Ладна, падкажу,— усміхнуўся Вожык.— Ты ж мяне частавала летась яблыкамі... Ну, слухай.

І расказаў бабулі пра тыя лекі...

Вось вяртаецца баба Волька дахаты. Сустракае яе ля ганка Галінка.

— Дзе ты, бабуля, гэтак доўга бавілася? — пытаецца незадаволена.— Я есці хачу!

www.kamunikat.org

— Дык еш, калі хочаш,— адказвае бабуля.— Звары што-небудзь сабе і з'еш. А я тым часам пайду паляжу. Надта я стамілася.

І пайшла.

Падбегла Галінка да печы, зазірнула ў адзін саган, у другі. Як яе варыць, тую ежу? Кінулася зноў да бабулі.

— Бабулька, любая мая,— кажа,— не атрымліваецца ў мяне нічога, не ўмею я варыць.— А есці так хочацца! Хадзем у гарод, трускалак мне дапаможаш нарваць.

Прыйшлі яны ў гарод. Бабуля села пад яблыняй і сядзіць сабе, адпачывае.

— Што ж ты, бабулечка, сядзіш? — пытаецца Галінка,— Чаму не збіраеш мне трускалак?

— Ох, ручкі-ножкі ў мяне ныюць! — завохкала баба Волька.— Ты ўжо як-небудзь сама, унучачка. А я адпачну.

Убрыла Галінка ў сярэдзіну градкі, стаіць, азіраецца: каб табе ягадка дзе! Як знарок усе пахаваліся.

Тым часам звечарэла.

Вярнуліся бабуля з унучкай дахаты, леглі спаць.

Раніцой прачынаецца Галінка, глядзь на гадзіннік: палова сёмай.

Будзіць яна бабулю і кажа:

— Бабулечка, ці не час табе ўставаць? Печ трэба распальваць ды сняданак ладзіць.

— Я б з задавальненем, унучачка,— кажа бабуля.— Але ж вельмі спаць хочацца. Цэлую ноч у хляве свінчо вішчэла, вачэй мне не давала змружыць. Ды і падлога ў хаце сцюдзёная, раптам ножкі мае змерзнуць? Патрывай, пакуль сонейка вышэй узнімецца.

— Ладна, патрываю,— пагадзілася Галінка.

Трывала, трывала, ды не вытрывала. Заплакала ды як кінецца да бабулінага ложка, як пачне бабулю лашчыць-цалаваць:

— Бабулечка, рожненькая, даруй мне. Я табесё-усё буду дапамагаць... І куранят буду даглядаць. І па ваду хадзіць. І грады палоць. Я буду дбайная, вось пабачыш. Толькі ўставай!

Устала бабуля, абнялаунучку ды пайшла да печы. Распаліла агонь, развяла муку ды давай аладкі пячы. Цэлую патэльню напякла.

Нееліся яны аладак, пачалі жывёлу карміць. Потым узяліся за грады.

— Вось бачыш, як добра разам усё рабіць,— кажа бабуля.— І спорна, і весела.

www.kamunikat.org

— Цяпер я табе заўсёды буду дапамагаць,— усміхнулася Галінка.— Слаўная ты мая бабулечка!

Так Вожык дапамог бабулі Галінку ад лянoты вылечыць.

www.kamunikat.org

# Бялячык

Апавяданне

Гэта ўзімку здарылася, якраз напярэдадні Новага года. Оля і Лёня сядзелі ў хаце за сталом, снедалі. І раптам убачылі праз акно ў садзе, між яблынь, на свежым снезе, нейкі невялікі белы камячок.

— Мама, глянь! — закрычаў усхвалявана Лёня.к Трус з клеткі вылез і па садзе бегае.

— То не трус,— папраўіла брата Оля. Яна была старэйшая за яго на два гады і таму ведала нашмат больш.— То зайчык. Праўда, мамачка?

— Праўда,— пагадзілася мама.

— А чаму ён такі белы? — спытаў Лёня.— Як снег.

— Каб лягчэй ад ворагаў было ўзімку ратавацца,— патлумачыла сястра.— Белае ж на белым не так бачна, вось ён і ўбраўся ў белае футра. А як зіма скончыцца і снег сыдзе, ён зменіць афарбоўку. Зробіцца шэранькі, пад колер сцяблінак.

Тым часам зайчык, натапырыўшы вушы, падбег да самай хаты. І тут Оля і Лёня ўбачылі на

снезе, там, дзе засталіся ягоныя сляды, штосьці чырвонае.

— Ой, дык ён жа паранены! — войкнула Оля.— Мамачка, можна, мы дапаможам зайчыку?

— Канечне, дапамажыце,— сказала мама.

Брат і сястра апрануліся, узялі з сабою кошык, асцярожна, каб не напалохаць звярка, выйшлі на вуліцу. Убчыўшы іх, зайчаня спрабавала ўцячы, але не здолела — не пускала параненая нага. Оля падбегла да яго, хуценька перанесла за вушы ў кошык. Потым дзеці прынеслі зайчыка ў хату, выпусцілі з кошыка на падлогу.

— А дрыжыць жа, дрыжыць увесь,— заўважыў Лёня.— Няйначай ад сцюжы.

— І не ад сцюжы, а ад сполаху,— папраўіла брата Оля.— Спужаўся, небарака.

— Правільна, дачушка,— сказала мама.— Ён маленькі, і ворагаў у яго шмат, таму і баіцца. А мы вось зараз пачастуем яго, ён і перастане баяцца.

Яна дастала з-пад прыпека морквіну, разрэзала яе, паклала перад зайчанём. Той з'еў ласунак, аблізнуўся: маўляў, вельмі смачна, дайце яшчэ. Потым Лёня частаваў звярка, пасля яго — Оля. Павесялеў заяц, перастаў дрыжэць — зразумеў, што тут яго не пакрыўдзяць.

З таго часу стаў Бялячык (так назвалі яго дзеці) жыць разам з людзьмі.

Восб жыве ён месяц, другі. Ужо і на двары пацяплела, і лёд на рацэ падаўся. Рана ў Бялячыка зусім загаілася, псць пацямнела, а сам ён усё часцей і часцей на акно пазірае.

— Мама, што наш зайчык увесь час на акно глядзіць? — спытала неяк у мамы Оля.

— Пэўна, на вуліцу хоча,— адказала мама.— Вось прыйшла вясна, усё ажыло, і нашаму зайчаняці на волю захацелася.

— А хіба ў нас яму дрэнна? — здзівіўся Лёня.— Вунь як кормім яго, ды і весела ў хаце.

— Весела то весела,— працягвала мама.— Але ж кожная істота: чалавек то ці звер — вольным быщь жадае, самому сабе гаспадаром.

— Хм, вольным,— засумняваўся Лёня.— Воля, можа, і няблага, ды хьл яго карміць будзе на волі?

— Э, сынку, заяц на волі не прападзе! — засмяялася мама.— Па-першае, капусты ў лесе ды на кустах поўна, яна так і называецца — заячая. Па-другое, іншых раслін розных шмат, лісця.

— А ўзімку?

— А ўзімку — кара на дрэвах, на прагалінах — сухая трава. Не, заяц у любое надвор'е не прападзе.

www.kamunikat.org

На тое ён і дзікі звер, каб у дзікай прыродзе жыць. Вось паглядзіце, як ён вушкі апусціў, і вачамі сумна паводзіць. Гэта значыць — па волі сумуе.

— Ну, калі так, то трэба выпусціць яго,— сказала Оля.

— А калі ён не захоча ад нас нікуды ісці? — засумняваўся Лёня.

— А вось гэта мы зараз праверым,— сказала мама.— Адчынім дзверы на ганак, і хай ён што хоча, тое і робіць.

Так і зрабілі.

Лёня адчыніў дзверы. Зайчык пасядзеў колькі хвілін, быццам у здранцвенні, ля парога, затым пераскочыў праз яго, адбегся да плота. Але тут жа і вярнуўся.

— Вось бачыце! — узрадаваўся Лёня.— Як я казаў, так і сталася. Не хоча ён ад нас адыходзіць.

Бялячык тым часам панюхаў паветра, уздыхнуў, нібыта развітваючыся з усімі, і зноў падаўся да плота. Потым пралез у дзірку між штыкецінамі, пабег да бульбянага поля. Азірнуўся яшчэ раз, стрыгнуў вушамі ды як скочыць у бульбоўнік! Толькі яго і бачылі.

Убачыўшы тое, заплакаў Лёня.

— Ай, не трэба бедаваць, сынку,— супакоіла яго мама.— Як бы добра ні было Бялячыку з намі, а з такімі, як сам, будзе лепш.

“Можа й праўда,— падумаў Лёня.— Сам жа ён так захацеў.”

І перастаў плакаць. І заўсёды потым, як прыбіваўся да хаты які-небудзь звярок, падлячыўшы яго, выпускаў на волю.

www.kamunikat.org

# Сам сябе пакараў

Апавяданне

Хлопчык Вася быў вельмі ганарысты. Нікога не паважаў, нікому ніколі слова добрага ў адказ на дабро не сказаў. Ідзе, бывала, па вуліцы і нават не павітаецца ні з кім, быццам не заўважае нікога. Людзі пасмейваліся ўпотай з Васі, але казаць нічога не казалі. Маўляў, што возьмеш з чалавека, калі бог яму розуму не даў.

Але вось неяк паехаў Вася ўлетку да бабулі і дзядулі ў вёску. А ў вёсцы ж не так, як у горадзе: што ў радасці, што ў няшчасці — заўсёды разам людзі. Усе ведаюць адзін аднаго, адзін аднаму дапамагаюць.

Сустрэлі Васю добра, асабліва бабуля. Што толькі ні рабіла яна дзеля ўнука, якімі прысмакамі ні частавала. А ён нават не падзякаваў ёй ні разу. Паесць сабе ды адыйдзецца маўчком ад стала, нібыта язык праглынуў.

Тое самае і з суседзямі. Пачастуюць яго, напрыклад, цётка Алена з дзядзькам Міколам парэчкамі, дык ён з'есць усё дарэшты і хценька збяжыць моўчкі з панадворка. Быццам гэта так і трэба, каб толькі пра яго ўсе дбалі ды клапаціліся.

Дзівяцца ўсе ў вёсцы: што за хлопчык гэты Вася? З выгляду дык чалавек як чалавек, а паводзіць сябе ані не ўмее. А больш за ўсё дзядулю Васеваму абыходзіць: за 80 гадоў мураша не пакрыўдзіў, а тут на старасці гэткае нялюдскае, ажно перад людзьмі сорамна. А Вася і не зважае на тое, ходзіць ды яшчэ пакеплівае са старога. Надакучыла гэта дзеду і вырашыў ён пагаварыць з унукам. Пасадзіў неяк увечары перад сабой і кажа: “Унучак, чаму ты ў мяне гэткі нявеглівы? Усе скардзяцца на цябе.” А Вася на тое: “Ну і хай скардзяцца, не мой клопат.” “Але ж такім нельга быць, бо ніхто любіць не будзе”,— працягвае дзед. “Ну і хай не любяць, абыдуся!” — як закрычыць тут Вася і да дзвярэй. Ды ляп імі колькі моцы і на вуліцу.

А было позна ўжо. І цёмна, хоць ты вока калі. І, як на злосць, аніводнае зорачкі на небе. Спужаўся Вася: а што як заблукае зараз у цемры ды і не знойдзе дадому дарогі. Памкнуўся назад, да хаты, але тут пра гонар свой успомніў. Стаў пасярод панадворка, чакае, ці не паклічуць дзед з бабаю. А яны ж старыя абое, дрэнна бачаць, ды і цёмна ўжо — вось і не заўважылі ўнука. Пастаяў — пастаяў гэтак Вася ды й падаўся з двара.

Пакуль ішоў да сцяжыны, два разы ў лужыну ўбіўся, моцна ногі змачыў. І яшчэ аб катарчаку нейкую спатыкнуўся. Ды так, што ажно ў вачах пазелянела. І ўсё роўна дамоў не захацеў вяртацца, пайшоў далей куды вочы глядзяць. Нарэшце ізбрыў на бульбянае поле. І тут, прама і баразне, лёг дый заснуў пад разлапістай бульбоўнінай.

А тым часам дзед з бабаю ўнука спахапіліся. Выйшлі на вуліцу, гукнулі раз, другі — няма хлапчука, як скрозь зямлю праваліўся. Спалохаліся старыя, пабеглі да суседзяў па дапамогу. “Можа, бачылі нашага Васю?” — пытаюцца.— “Не, не бачылі!” — адказваюць суседзі.

Вырашылі шукаць. Выйшлі гуртам за гароды і ну клікаць, ліхтарыкамі наваколле высвечваць. А Вася спіць сабе ў баразне і не чуе, які вэрхал з-за яго ўзняўся. Можа, і не знайшлі б уцекача, калі б не сабака Рэкс. Узяў Рэкс след і скраз на спячага ў бульбоўніку Васю і натыкнуўся. Пачаў брэхам клікаць людзей — тут Вася і прачнуўся. Працёр кулаком вочы, глядзіць — ажно то Рэкс побач. Тут дзед з бабаю і суседзямі прыбеглі, давай хлопчыку падняцца дапамагаць. Адзін кашулю папраўляе, другі твар выцірае, трэці шнурок на чаравіку пасабляе завязаць.

Сорамна стала Васю за ранейшыя свае ўчынкі. Апусціў ён вочы долу ды як заплача.

Прывялі дзед з бабаю Васю дахаты, глядзь, а ў яго лоб чырвоны, ажно палае ад тэмпературы. Заварыла бабуля малінніку з мёдам, дала ўнуку папіць. І прастуду як рукой зняло. Зноў вясёлы стаў Вася і бадзёры, як раней.

А галоўнае: ад ганарлівасці пазбавіўся. Як падмянілі Васю — ветлівы стаў з усімі, ласкавы. Бо зразумеў: як ты да людзей, так і людзі да цябе будуць.

www.kamunikat.org

# Змест

Алфавіт (казка)

Кошка Мурка і коска (казка)

Знак на небе (апавяданне)

Пчолка і Абыяк (казка)

Вожыкавы лекі (казка)

Бялячык (апавяданне)

Сам сябе пакараў (апавяданне)

www.kamunikat.org

Літаратурна-мастацкае выданне

Сіўко Франц Іванавіч

Бялячык

Казкі і апавяданні

Рэдактар У. М. Мазго

Мастацкі рэдактар В. А. Макаранка

Тэхнічны рэдактар

Карэктар

Камп'ютэрная вёрстка

www.kamunikat.org

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год